УДК 811.161.3(072)

# ФУНКЦЫЯНАЛЬНАЯ ПІСЬМЕННАСЦЬ ЯК ВЫНІК АДУКАЦЫЙНЫХ ДАСЯГНЕННЯЎ ВУЧНЯЎ

**Л.С. Васюковіч**
*Віцебскі філіял Міжнароднага ўніверсітэта "МІТСО"*

*Паняцце функцыянальнай пісьменнасці набывае ў сучасных даследаваннях міждысцыплінарны статус. У артыкуле паняцце дэталізуецца ў культурна-гістарычным, філасофскім, сацыяльным, псіхалагічным і метадычным аспектах.*

*Мэта артыкула – аналіз функцыянальнай пісьменнасці як інтэграванага індыкатара адукацыйных дасягненняў навучэнцаў у міждысцыплінарным кантэксце.*

***Матэрыял і метады.** Матэрыялам паслужыла навуковая і навукова-метадычная літаратура па праблеме даследавання па педагогіцы, методыцы выкладання моў, іншых галінах гуманітарных ведаў. Пры аналізе выкарыстаны комплекс метадаў – тэарэтычных, эмпірычных, статыстычных.*

***Вынікі і іх абмеркаванне.** Даследаванні функцыянальнай пісьменнасці маюць, як правіла, полідысцыплінарны характар. Новыя вектары ў развіцці грамадства актуалізуюць сацыяльны, адукацыйны, асобасны і практыка-арыентаваны кампаненты паняцця.*

***Заключэнне.** Функцыянальная пісьменнасць як вынік адукацыйных дасягненняў вучняў трактуецца як інтэграванае ўтварэнне, што выступае характарыстыкай асобы як члена соцыуму. Функцыянальны кантэкст засваення ведаў, фарміравання базавых уменняў прадвызначаюць жыццёвы і сацыяльны поспех чалавека.*

***Ключавыя словы:** функцыянальная пісьменнасць, адукацыйныя дасягненні, міждысцыплінарны статус функцыянальнай пісьменнасці.*

# FUNCTIONAL LITERACY AS A RESULT OF STUDENT ACADEMIC ACHIEVEMENTS

**L.S. Vasiukovich**
*Vitebsk Branch of the International University MITSO*

*The concept of functional wliteracy acquires an interdisciplinary status in modern research. The article details the concept in cultural, historical, philosophical, social, psychological and methodological aspects.*

*The purpose of the work is to analyze functional literacy as an integrated indicator of students' academic achievements in an interdisciplinary context.*

***Material and methods.** The material was scientific and scientific-methodological literature on the research problem in pedagogy, methods of teaching languages, and other areas of humanities – philosophy, psychology, sociology. In the process of analysis, a complex of methods was used – theoretical, empirical, statistical.*

***Findings and their discussion.** Research on functional literacy is, as a rule, multidisciplinary in nature. New vectors in the development of society actualize the social, educational, personal and practice-oriented components of the concept.*

***Conclusion.** Functional literacy as the result academic achievements is interpreted as an integrated education, which is a characteristic of the individual as a member of society. The functional context of knowledge acquisition and the formation of basic skills predetermine a person's life and social success.*

***Key words:** functional literacy, academic achievements, interdisciplinary status of functional literacy.*

Удасканаленне школьнай адукацыі абумоўлена павышэннем патрабаванняў да яе якасці, што праяўляецца ў функцыянальнай гатоўнасці выпускнікоў школ вырашаць не толькі пазнавальныя, але і жыццёвыя задачы ў розных сферах дзейнасці. *Якасць ведаў, уменняў, кампетэнцый* як паказчык выніковасці пазнання адносіцца да ключавых у кантэксце характарыстык стратэгіі развіцця айчыннай сістэмы адукацыі. На думку даследчыкаў, пра гарманічнае развіццё нацыянальнай сістэмы ацэнкі якасці адукацыі сведчаць наступныя крытэрыі: "*Сацыяльна-філасофскія* (змены ў грамадстве, што ўплываюць на каштоўнасныя мадэлі соцыуму; *псіхолага-педагагічныя* (якім павінен быць

адукацыйны працэс, каб раскрываць прыродны патэнцыял асобы); *інфармацыйна-кваліметрычныя* (якія ўласцівасці сістэмы падпадаюць пад вымярэнні і з'яўляюцца індыкатарамі для фармулёўкі высноваў пра якасць сістэмы)" [1, с. 4]. Паводле міжнароднага даследавання якасці адукацыі PISA, эталонным крытэрыем узроўню дасягненняў вучняў становіцца іх функцыянальная пісьменнасць, што ўстанаўлівае канцэптуальныя рамкі якасці і вызначае, у якой ступені вучні падрыхтаваныя для жыцця ў соцыуме. Павышаны інтарэс прадстаўнікоў розных прадметных галін да праблемы пісьменнасці школьнікаў зразумелы: менавіта ўзровень асноўных разнавіднасцей функцыянальнай пісьменнасці (чытацкай, матэматычнай, прыродазнаўчай) становіцца індыкатарам якасці засваення праграм сярэдняй адукацыі.

Мэта артыкула – аналіз функцыянальнай пісьменнасці як інтэграванага індыкатара адукацыйных дасягненняў навучэнцаў у міждысцыплінарным кантэксце.

**Матэрыял і метады.** Матэрыялам паслужыла навуковая і навукова-метадычная літаратура па праблеме даследавання па педагогіцы, методыцы выкладання моў, іншых галінах гуманітарных ведаў (філасофія, псіхалогія, сацыялогія). Пры аналізе выкарыстаны комплекс метадаў – тэарэтычных, эмпірычных, статыстычных.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Якасць выступае комплекснай характарыстыкай, што выяўляе ступень адпаведнасці вынікаў стандартам і вучэбным праграмам, у якіх кансалідавана сфармуляваны патрабаванні да адукацыйнага працэсу. Паняцце якасці адукацыі мае дыялектычны характар, абумоўлены патрабаваннямі грамадства на канкрэтным этапе развіцця. У сучасных умовах ацэнка якасці падразумявае "комплекс задач, што ажыццяўляюцца на розных узроўнях адукацыйнай сістэмы рознымі суб'ектамі пазнавальнага працэсу, з мэтай атрымаць інфармацыю не толькі для ацэнкі дасягненняў вучняў як спосабу іх рэйтынгавання, але і для функцыянавання сістэмы ў цэлым" [2, с. 5].

Фарміраванне функцыянальнай пісьменнасці на сённяшні дзень заяўлена як адна са стратэгічных задач агульнай сярэдняй адукацыі, паколькі навыкі, набытыя ў школе, паглыбляюцца ў працэсе далейшага навучання асобы. Адпаведна ўзрастае неабходнасць вывучэння феномена ў тэарэтычным і прыкладным аспектах з мэтай выявіць спецыфіку паняцця ў розных дыскурсах.

Зараз як ніколі "важны выхад да міждысцыплінарнасці, у першую чаргу, праз абмеркаванне і ўлік сучасных геапалітычных тэндэнцый, іх уплыву на сусветную адукацыйную прастору і нацыянальныя сістэмы" [3, с. 108]. У рэчышчы рухомасці меж паміж рознымі галінамі ведаў, культуры цяжка ўявіць работы, "ізаляваныя" ад патэнцыяльных паралеляў, кантэкстаў, супастаўленняў. Навізна як дамінанта сучаснага існавання грамадства выклікае патрэбнасць у міждысцыплінарных даследаваннях, прыметамі якіх, на думку І.М. Асмалоўскай, выступаюць "агульны прадмет; узаемадапаўненне метадаў; распрацоўка тэарэтычных асноў даследавання; прыналежнасць вынікаў міждысцыплінарнага навуковага даследавання да розных галін навукі" [4, с. 58–59]. Вывучэнне функцыянальнай пісьменнасці на стыку навук валодае ўсімі якасцямі дысцыплінарнага даследавання: прадмет сфармуляваны ў кантэксце некалькіх дысцыплін; сінтэз выкарыстаных паняццяў, метадаў адбываецца ў агульнапедагагічным рэчышчы; веды інтэгруюцца на мяжы розных навуковых галін – філасофіі, псіхалогіі, сацыялогіі, культуралогіі, узроставай фізіялогіі і інш.

Канкрэтызуем аспекты вывучэння функцыянальнай пісьменнасці з улікам міждысцыплінарнага статусу паняцця. Найперш адзначым *культурна-гістарычны характар* функцыянальнай пісьменнасці. Даследчыкі прыходзяць да адназначнага вываду пра залежнасць пісьменнасці ад узроўню тэхналагічнага і культурнага развіцця грамадства (А.Е. Лебедзеў, Л.М. Палішчук, П.І. Фралова і інш.). Змест паняцця эвалюцыяніраваў на працягу станаўлення і развіцця чалавецтва, паколькі разуменне пісьменнасці непасрэдна дыктуецца ўзроўнем духоўнай культуры соцыуму. Натуральна, што ўяўленне пра функцыянальную пісьменнасць у розныя гістарычныя перыяды залежыць ад здольнасці асобы да паспяховай сацыялізацыі і адаптацыі на рынку працы. Паводле прызнання айчынных вучоных, станаўленне паняцця адбывалася пад уплывам працэсаў глабалізацыі. На думку Л.М. Палішчук, эвалюцыя значэння слова пачыналася ад агульнай трактоўкі пісьменнасці "як здольнасці асобы чытаць, разумець і складаць простыя сціслыя тэксты, што мелі адносіны да паўсядзённага жыцця", пасля чаго адбылося больш шырокае разуменне паняцця як "набору ведаў, уменняў і навыкаў, неабходных для нармальнай жыццядзейнасці чалавека" [5, с. 17].

На *філасофскім узроўні* функцыянальная пісьменнасць разглядаецца як лагічны этап непарыўнага развіцця чалавека, як "культурны стандарт" функцыянавання грамадства (Б.С. Гершунскі, С.А. Крупнік, У.У. Мацкевіч, В.А. Ярмоленка і інш.). У агульнафіласофскім плане функцыянальная пісьменнасць усведамляецца беларускімі даследчыкамі С.А. Крупнік і У.У. Мацкевічам як "мера гуманітарнага развіцця нацыі, краіны або групы людзей. Толькі ў такім варыянце пісьменнасць можа выступаць у якасці паказчыка развіцця асобнага чалавека" [6, с. 16]. Вучоныя лічаць, што адказнасць за паспяховыя вынікі фарміравання пісьменнасці павінна раздзяляць не толькі школа, але і грамадства. У манаграфіі (2008 год) С.А. Крупнік і У.У. Мацкевіч прапанавалі праграму развіцця функцыянальнай пісьменнасці ў Беларусі на 2000–2010 гады. Варта зазначыць, што падобныя працы выклікалі ўстойлівы навуковы інтарэс да праблемы сярод шырокага кола педагагічнай грамадскасці, тэарэтыкаў і практыкаў у галіне адукацыі. Дзякуючы менавіта гэтым даследаванням паняцце функцыянальнай пісьменнасці атрымала зместавае напаўненне ў слоўнікавых артыкулах лексікаграфічных прац (дарэчы, гэта зроблена раней за рускамоўныя слоўнікі, якія і па сённяшні дзень непаслядоўна фіксуюць тэрмін нават у педагагічных выданнях). Яшчэ ў 2010 годзе тэзаўрус сацыялагічных даследаванняў папоўніўся асобным артыкулам, у якім функцыянальная пісьменнасць раскрываецца як "здольнасць чалавека ўступаць у адносіны са знешнім асяроддзем і максімальна хутка адаптавацца і функцыянаваць у ім. У адрозненне ад элементарнай пісьменнасці як здольнасці чытаць, разумець, складаць простыя сціслыя тэксты і ажыццяўляць найпрасцейшыя арыфметычныя дзеянні, функцыянальная пісьменнасць ёсць атамарны ўзровень ведаў, уменняў і навыкаў, які забяспечвае нармальнае функцыянаванне ў сістэме сацыяльных зносін і які лічыцца мінімальна неабходным для жыццядзейнасці асобы ў канкрэтным культурным асяроддзі" [7]. Пазней, у 2015 годзе, слоўнікавы артыкул "Функцыянальная пісьменнасць дарослага" з'явіўся ў "Беларускай педагагічнай энцыклапедыі". Паняцце кантэкстуалізуецца як "здольнасць чалавека ўступаць у адносіны са знешнім асяроддзем і максімальна хутка адаптавацца і функцыянаваць у ім; як мінімальны ўзровень валодання знакавымі сістэмамі, што дазваляе дарослым рэалізаваць свае сацыяльныя функцыі, забяспечваць камфортную жыццядзейнасць, сацыяльны статус і самарэалізацыю ў грамадстве. У цэлым функцыянальная пісьменнасць дарослых характарызуе здольнасць чалавека жыць і ўзаемадзейнічаць у пэўных цывілізацыйных умовах, гэта азначае, што яго веды аб навакольным жыцці і мове зносін фарміруюць уменне – быць паспяховым" [8, с. 478]. Філасофскае асэнсаванне феномена функцыянальнай пісьменнасці ўзмацніла гуманітарную састаўную паняцця, што дазваляе аналізаваць сучасную сітуацыю ў сацыякультурным кантэксце і прымаць абгрунтаваныя, рацыянальныя рашэнні ў розных сферах дзейнасці.

*Сацыяльны аспект* паняцця функцыянальнай пісьменнасці прымаўся пад увагу першасна, паколькі ўзнікненне феномена тлумачыцца ўздзеяннем грамадства. Яшчэ ў 1979 годзе ЮНЕСКА характарызавала функцыянальна пісьменнага чалавека наступным чынам: ён свабодна карыстаецца чытаннем, пісьмом і матэматычнымі падлікамі, не толькі развівае свае індывідуальныя здольнасці, але і садзейнічае далейшаму развіццю сацыяльнага акружэння. Сацыяльны кантэкст даследаванняў функцыянальнай пісьменнасці канкрэтызаваўся і надалей у кантэксце дакументаў такіх міжнародных арганізацый, як Арганізацыя Аб'яднаных Нацый, Арганізацыя эканамічнага супрацоўніцтва і развіцця. Напрыклад, 1990-ы быў аб'яўлены ЮНЕСКА Міжнародным годам пісьменнасці. Генеральная Асамблея ААН абазначыла 2003–2012 гады прысвечанымі 10-годдзю пісьменнасці. З мэтай дасягнення ўсеагульнай адукацыі ААН прыняла рэзалюцыю "Десятилетие грамотности ООН: образование для всех" (2009 год). У дакуменце выразна акрэслівалася характарыстыка функцыянальна пісьменнага чалавека – паўнацэннага ў функцыянальным плане члена грамадства.

Зараз паняцце *функцыянальная пісьменнасць* разумеецца як сацыяльная практыка, што спадарожнічае культурнаму грамадству, ацэньваецца як аснова развіцця чалавечага капіталу ва ўмовах глабалізацыі, як індыкатар эканамічнага ўзроўню краіны, паказчык эфектыўнага функцыянавання рынку працы з высокай канкурэнцыяй. Варта пагадзіцца з Л.М. Палішчук, што сучаснае разуменне функцыянальнай пісьменнасці ўключае "падрыхтоўку чалавека да прафесійнай і рознага віду сацыяльнай дзейнасці, паколькі катэгорыі пісьменнасці належыць статус ключавога паняцця ў тэорыі дзейнасці сацыяльнага суб'екта" [5, с. 27]. Адпаведна базісам функцыянальнай пісьменнасці выступае гатоўнасць

і здольнасць канструктыўна ўзаемадзейнічаць у соцыуме, якія фарміруюцца на базе ведаў, уменняў, навыкаў, вопыту самастойнай сацыяльнай практыкі.

Да інтэрпрэтацыі аспектаў функцыянальнай пісьменнасці актыўна далучаюцца працы, выкананыя ў *псіхалагічным рэчышчы* (А.Г. Асмолаў, К.М. Паліванава, М.А. Халодная, А.А. Юрына і інш.). Псіхалагічныя даследаванні (Н.Ф. Галаванава, І.У. Дубровіна, Л.С. Калмагорава, А.В. Мудрык, В.С. Мухіна, А.А. Рэан, М.А. Халодная і інш.) раскрываюць асаблівасці сацыялізацыі асобы на розных узроставых этапах яе станаўлення, што падразумявае вопыт рашэння жыццёвых задач як кампанента функцыянальнай пісьменнасці, практыку асэнсавання праблем, з якімі сустракаюцца навучэнцы ў рэальным жыцці. Псіхалагічная пісьменнасць спрыяе назапашванню станоўчага вопыту сацыяльных адносін.

Перад установамі адукацыі фармулюецца задача фарміравання асобы з развітымі духоўна-маральнымі каштоўнасцямі, здольнай да рэфлексіі ўласных здольнасцей, псіхалагічна падрыхтаванай да "дарослага" жыцця. У адукацыйных стандартах указваецца, што мэтамі агульнай сярэдняй адукацыі з'яўляюцца: фарміраванне асобы навучэнца, яе сацыяльных кампетэнцый і маральнай сталасці, развіццё кампетэнцый сацыяльнага ўзаемадзеяння, улік спецыфікі псіхафізічнага развіцця.

Псіхалагічная пісьменнасць мае на ўвазе не толькі веды аб сусвеце, прыродзе і людзях, але і спазнанне суб'ектам самога сябе – сваіх здольнасцей, інтарэсаў, жаданняў, асэнсаванне сябе. На этапе ўключэння ў сацыяльнае акружэнне важна падтрымаць імкненне да самапазнання, самавызначэння жыццёвых перспектыў. Пазітыўным вынікам будзе свядомая дзейнасць да самааналізу, самакантролю, устойлівая адэкватная самаацэнка. Псіхалагічная пісьменнасць выступае ўмовай паўнацэннага маральнага развіцця асобы, у кантэксце якога фарміруецца ўласная іерархія каштоўнасцей, адбываецца прызнанне ідэалаў, традыцый, норм, характэрных для культурнага акружэння, прымяненне да сябе тых жа крытэрыяў, што і да іншых, пры гэтым акцэнтуецца здольнасць улічваць уласныя і чужыя патрэбнасці і інтарэсы. Адэкватныя псіхалагічныя ўстаноўкі забяспечваюць дасягненне выпускніком асобасных вынікаў засваення адукацыйных праграм. Сфарміраваная псіхалагічная пісьменнасць як фактар сацыялізацыі асобы навучэнца дапамагае прайсці шлях да самавызначэння, да сацыяльна адказных паводзін.

У кантэксце псіхалагічных работ найбольш доказнай выглядае пазіцыя М.А. Халоднай, перакананай, што тлумачэнне функцыянальнай пісьменнасці празмерна пашырылася ў параўнанні з першапачатковым, выйшла са сферы вузкага практычнага прымянення ў больш шырокую – агульнакультурную. На думку псіхолага, асноўныя рысы функцыянальнай пісьменнасці абмежаваны сацыяльным вопытам, скіраваны на вырашэнне бытавых праблем, выступаюць сітуатыўнай характарыстыкай (паколькі праяўляюцца ў канкрэтных сацыяльных абставінах), абумоўленай рашэннем стандартных задач, звязаных з элементарным (базавым) узроўнем навыкаў чытання і пісьма; непасрэдна суадносяцца з ацэнкай якасці адукацыі [9, с. 14].

Перспектыўнай з'яўляецца ідэя М.А. Халоднай адносна аднамернай арыентацыі на фарміраванне функцыянальнай пісьменнасці. Аднабаковая ацэнка з'явы можа прымітызаваць мэты школьнай адукацыі і перашкодзіць станаўленню гарманічна развітай асобы. Прыярытэтам адукацыі, на думку даследчыцы, павінна быць інтэлектуальнае выхаванне, паколькі здольнасці людзей выступаюць самай эфектыўнай крыніцай чалавечай цывілізацыі. З гэтай прычыны "ў эканамічным і культурным спаборніцтве будуць выйграваць тыя краіны, што змогуць стварыць найбольш дасканалую сістэму адукацыі, якая гарантуе паўнацэннае развіццё разумовых магчымасцей навучэнцаў" [9, с. 16].

Прызнаючы неабходнасць быць у метадычным "трэндзе" міжнародных дасягненняў, мы падзяляем пазіцыю тых вучоных, якія выказваюць трывогу адносна ўстановак сучаснай школы выключна на адукацыйныя вынікі. Лічым, што пры фармуляванні вынікаў акцэнт варта рабіць не толькі на функцыянальнай пісьменнасці, кампетэнцыях, уменнях. Задачай адукацыі павінна стаць фарміраванне асобы, што валодае ведамі, уменнямі, вопытам, маральнымі якасцямі, характарызуецца ўласнай пазіцыяй. Так, І.А. Зімняя справядліва сцвярджае, што галоўны вынік навучання – "гэта сам чалавек, яго вопыт як сукупнасць сфарміраваных інтэлектуальных, асобасных якасцей, ведаў і ўменняў, што дазваляюць адэкватна дзейнічаць на іх аснове ў любой сітуацыі" [10, с. 59]. Мы падтрымліваем думку даследчыкаў (І.А. Зімняя, В.І. Слабодчыкаў і інш.) і сцвярджаем, што ў цэнтры сучасных адукацыйных

рэалій павінен быць сам навучэнец, а не набор кампетэнцый, разнавіднасцей функцыянальнай пісьменнасці. Выпускніку неабходна засвоіць сістэму ведаў, спосабы дзейнасці, навучыцца бачыць і ўсведамляць праблемы, аналізаваць жыццёвыя сітуацыі як задачы, што падразумяваюць пошук і рэалізацыю аптымальных варыянтаў рашэння. Аднак найперш яму трэба ўсведамляць сябе асобай, носьбітам нацыянальных і культурных каштоўнасцей, “стаць суб’ектам уласнага развіцця” [11, с. 14].

Аналіз развіцця паняцця ў кантэксце міждысцыплінарнага падыходу дае магчымасць выявіць яго шматмерны статус. Вызначальнымі для функцыянальнай пісьменнасці з’яўляюцца наступныя моманты:

– дэфініцыя функцыянальнай пісьменнасці павінна афармляцца з улікам не толькі педагагічных, але і псіхалагічных, сацыяльных, дзейнасных каардынат;

– зместавае поле праблемы развіваецца пад уплывам адукацыйнай практыкі, адпаведнасць новым дыдактычным арыенцірам патрабуе праектавання працэсу навучання на актуальнай тэарэтычнай аснове;

– даследаванні функцыянальнай пісьменнасці маюць, як правіла, полідысцыплінарны характар, таму павінны ўлічваць вынікі “рэсурсных” дысцыплін (філасофскіх, мовазнаўчых, педагагічных, псіхалагічных);

– паняційнае поле праблемы пашыраецца ў каардынатах развіцця сучаснага грамадства, навукі, культуры, змяненняў інфармацыйных патрэбнасцей суб’ектаў працэсу пазнання, у выніку чаго з’яўляюцца новыя віды пісьменнасці, нараджаюцца класіфікацыі, сістэматызуецца назапашаны эмпірычны матэрыял, што спараджае “часавы кантэкст” разумення паняцця;

– у залежнасці ад аспекту аналізу функцыянальная пісьменнасць можа быць прадстаўлена ў розных інтэрпрэтацыях: як устойлівая характарыстыка асобы; норма культурных форм існавання чалавека і разнавіднасцей грамадскіх адносін; паказчык якасці агульнай і прафесійнай адукацыі; своеасаблівы “цэнз” на ўваходжанне ў пэўныя сацыяльныя групы; мера якасці жыцця; асаблівасці развіцця сацыяльна-эканамічнай сістэмы;

– функцыянальная пісьменнасць выступае інтэграваным індыкатарам адукацыйных дасягненняў, што характарызуе патрэбнасці асобы, грамадства і дзяржавы. З улікам працэсаў інтэграцыі ўзровень функцыянальнай пісьменнасці павінен вызначацца праз супастаўленне з міжнароднымі паказчыкамі;

– дыялектычны характар разумення функцыянальнай пісьменнасці абумоўлены культурна-гістарычным кантэкстам;

– вывучэнне праблемы функцыянальнай пісьменнасці павінна мець сістэмны, полідысцыплінарны характар. Праблема не можа вырашацца выключна з уласна педагагічных пазіцый;

– функцыянальная пісьменнасць мае непарыўны ў часе характар. На думку Г.П. Зінчанкі, “чалавека немагчыма навучыць раз і на ўсё жыццё. Нават самая лепшая ўстанова адукацыі не можа даць веды сваім вучням у поўным аб’ёме. Затое патрабуецца ўменне іх своечасова атрымліваць і правільна выкарыстоўваць. З гэтай прычыны важна сфарміраваць у кожнага патрэбнасць да бесперапыннай адукацыі, навыкі самастойнага здабывання ведаў, уменне ўключаць новыя веды ў сістэму засвоеных” [12, с. 67].

**Заключэнне.** Такім чынам, функцыянальная пісьменнасць трактуецца як інтэграванае ўтварэнне, што фарміруецца на працягу ўсяго жыцця і выступае характарыстыкай асобы, з’яўляецца вынікам, абумоўленым сацыяльнымі і асобаснымі фактарамі адукацыйнай прасторы. Функцыянальны кантэкст засваення ведаў, сфарміраванасць уменняў у значнай ступені прадвызначаюць жыццёвы і сацыяльны поспех чалавека.

Новыя вектары ў развіцці грамадства актуалізуюць сацыяльны, адукацыйны, асобасны і практыка-арыентаваны кампаненты паняцця. Акцэнтуецца *сацыяльная састаўная*, што праецыруе самавызначэнне асобы, асэнсаванне ўласнай важнай ролі ў жыцці і грамадстве. *Практычны кампанент* абумоўліваецца назашваннем сацыяльнага і культурнага вопыту навучэнцаў. Істотным складнікам выступаюць *якасці асобы*, якія дазваляюць эфектыўна дзейнічаць у соцыуме – камунікатыўнасць, адказнасць, крэатыўнасць, уменне наладжваць дыялог як аснову для эфектыўнага ўзаемадзеяння з іншымі членамі грамадства, уменні арганізоўваць уласную дзейнасць і прадбачыць, ацэньваць яе вынікі.

## ЛІТАРАТУРА

1. Теоретико-методологические основы развития национальной системы оценки качества педагогического образования: моногр. / А.И. Жук [и др.]; под ред. А.И. Жука, А.В. Торховой. – Минск: БГПУ, 2023. – 249 с.
2. Развитие системы оценки качества образования в Республике Беларусь. Общее среднее образование / М.Б. Горбунова [и др.]; под науч. ред. В.Ф. Русецкого. – Минск: Нац. ин-т образования, 2022. – 390 с.
3. Иванова, С.В. Современные направления компаративных исследований образовательного пространства / С.В. Иванова // Педагогика. – 2016. – № 7. – С. 104–110.
4. Осмоловская, И.М. Дидактика: от классики к современности: монография / И.М. Осмоловская. – М.; СПб.: Нестор-История, 2020. – 247 с.
5. Полищук, Л.Н. Функциональная грамотность: сущность и становление: монография / Л.Н. Полищук. – Мозырь: МГПУ им. И.П. Шамякина, 2008. – 212 с.
6. Крупник, С.А. Функциональная грамотность в системе образования Беларуси / С.А. Крупник, В.В. Мацкевич. – Минск: Акад. последипломн. образования, 2003. – 126 с.
7. Мацкевич, В.В. Функциональная грамотность / В.В. Мацкевич, С.А. Крупник // Новейший социологический словарь / сост. А.А. Грицанов [и др.]. – Минск: Книжный дом, 2010. – С. 1185–1186.
8. Кошель, Н.Н. Функциональная грамотность взрослого / Н.Н. Кошель // Белорусская педагогическая энциклопедия: в 2 т. / Н.П. Баранова [и др.]. – Минск: АіВ, 2015. – Т. 2. – С. 478–479.
9. Холодная, М.А. Приоритеты современного школьного образования: способность адаптироваться к социуму или интеллектуальное развитие и воспитание? / М.А. Холодная // Психология и современное российское образование: материалы IV Всерос. съезда психол. России, Москва, 8–12 дек. 2018 г. / редкол.: С.Д. Поляков [и др.]. – М., 2018. – С. 12–16.
10. Зимняя, И.А. Педагогическая психология / И.А. Зимняя. – М.: МПСИ, 2010. – 447 с.
11. Бушная, Н.В. Формирование социальной культуры старшеклассников в условиях воспитательного пространства школы мегаполиса: автореф. дис. … канд. пед. наук: 13.00.02 / Н.В. Бушная; Нац. ин-т образования. – Минск, 2013. – 22 с.
12. Зинченко, Г.П. Универсальный способ деятельности / Г.П. Зинченко // Педагогика. – 1990. – № 4. – С. 61–68.

## REFERENCES

1. Zhuk A.N. *Teoretiko-metodologicheskiye osnovy razvitiya natsionalnoi sistemy otsenki kachestva pedagogicheskogo obrazovaniya: monografiya* [Theoretical and Methodological Bases of the Development of the National System of Teaching Education Quality Assessment: Monograph], Minsk: BGPU, 2023, 249 p.
2. Gorbunova M.B. *Razvitiye sistemy otsenki kachestva obrazovaniya v Respublike Belarus. Obshcheye sredneye obrazovaniye* [Development of Education Quality Assessment System in the Republic of Belarus. General Secondary Education], Minsk: Nats. in-t obrazovaniya, 2022, 390 p.
3. Ivanova S.V. *Pedagogika* [Science of Education], 2016, 7, pp. 104–110.
4. Osmolovskaya I.M. *Didaktika: ot klassiki k sovremennosti: monografiya* [Didactics: from Classics to Present Day: Monograph], M.; SPb.: Nestor-Istoriya, 2020, 247 p.
5. Polishchuk L.N. *Funktsionalnaya gramotnost: sushchnost i stanovleniye: monografiya* [Functional Literacy Essence and Maturation: Monograph], Mozyr: MGPU im. I.P. Shamiakina, 2008, 212 p.
6. Krupnik S.A., Matskevich V.V. *Funktsionalnaya gramotnost v sisteme obrazovaniya Belarusi* [Functional Literacy in the System of Education in Belarus], Minsk: Akad. poslediplomn. obrazovaniya, 2003, 126 p.
7. Matskevich V.V., Krupnik S.A. *Noveishi sotsiologicheski slovar* [New Sociological Dictionary], Minsk: Knizhny dom, 2010, pp. 1185–1186.
8. Koshel N.N. *Belorusskaya pedagogicheskaya entsiklopediya: v 2 t.* [Belarusian Pedagogical Encyclopedia: in 2 Volumes], Minsk: AiB, 2015, 2, pp. 478–479.
9. Kholodnaya M.A. *Psikhologiya i sovremennoye rossiiskoye obrazovaniye: materialy IV Vseros. syezda psikhol. Rossii, Moskva, 8–12 dek. 2018 g.* [Psychology and Contemporary Russian Education: Proceedings of the 4th All-Russian Congress of Psychologists of Russia, Moscow, December 8–12, 2018], M., 2018, pp. 12–16.
10. Zimniaya I.A. *Pedagogicheskaya psikhologiya* [Pedagogical Psychology], M.: MPSI, 2010, 447 p.
11. Bushnaya N.V. *Formirovaniye sotsialnoi kultury starsheklassnokov v usloviyakh vospitatelnogo prostranstva shkoly megapolisa: avtoref. dis. … kand. ped. nauk* [Shaping Social Culture of High School Students in the Conditions of Education Space of the Megapolis School: PhD (Education) Dissertation Summary], Minsk, 2013, 22 p.
12. Zinchenko G.P. *Padagogika* [Science of Education], 1990, 4, pp. 61–68.


*Паступіў у рэдакцыю 05.01.2024*

***Адрас для карэспандэнцыі:*** e-mail: vasuk.mila@tut.by – Васюковіч Л.С.